**ВОДГУК**
**афіцыйнага апанента кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта К.І. Козака на дысертацыйную работу Івана Іванавіча Сацукевіча «Урбананімія Мінска (1793–1991)», прадстаўленную на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя**

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якой яна прадстаўлена да абароны**

Дысертацыйнае даследавананне Івана Іванавіча Сацукевіча «Урбананімія Мінска (1793–1991)», прадстаўленае на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя згодна теме, зместу, прадмету даследававання, палажэнняў, якія вынесены на абарону.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Гістарычны шлях Мінска – аднаго з буйнейшых гарадоў Еўропы, які на працягу XVIII–XX ст. прайшоў этапы дзяржаўнасці Расійскай імперыі ў якасці губернскага горада, ССБР–БССР–ЛБССР– БССР, як сталіцы адной з рэспублік СССР. Праз межы жыцця яго жыхароў прайшлі шматлікія і разбуральныя войны, ваенныя канфлікты, адбудовы, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя перамены, якія прывялі да замацавання высокага міжнароднага і нацыяльнага статусу сталіцы Рэспублікі Беларусь. У гэтым накірунку зазначаная актуальнасць, вызначаныя мэты і задачы даследавання аб урбананіміі Мінска цалкам знаходзіць падтрымку на шляху распрацоўкі адзначанай праблемы. Тэкст працы добра апрацаваны, чытаецца з цікавасцю, пры даволі вялікім факталагічным матэрыяле. Адчуваецца прафесійнае разуменне тэмы і глыбокае валоданне матэрыялам. Уласцівы аўтарскі падыход да характарыстык, адзнак, феміналогіі пытання. Сама праца складаецца з выпрацаванай структураў глаў, якія арганічны ў вызначаных падраздзелах. Маюцца спасылкі на крыніцы і літаратуру па кожнай з вызначаных частак для разгляду як інфармацыйнага наратыву, так і абагульненняў.

Палажэнні, якія вынесены на абарону згодна задач – вынікова прадстаўляюць этапы ўрбананіміі Мінска з іх асаблівымі характарыстыкамі; вызначанымі трансфармацыйнымі карэннымі ўплывамі пры радыкальных зменах ўнутрагарадскіх назваў Мінска, у прыватнасці, пры традыцыйных

прынцыпах вызначэнняў унутрагарадскіх аб'ектаў – аўтар аргументавана прадстаўляе новыя, як ўласцівы савецкаму часу XX ст.

**Навуковая навізна.** Дадзеная работа з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі спецыяльным комплексным даследаваннем унутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. Упершыню на падставе шырокага кола крыніц сістэмна аналізуецца працэс генезісу ўнутрыгарадскіх найменняў Мінска і паказваецца сувязь паміж урбанонімамі і сацыяльна-эканамічным, рэлігійным і палітычным развіццём Беларусі. У выніку ўстаноўлены спосабы і этапы фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. Вызначаны найважнейшыя фактары фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў. Раскрываюцца прычыны карэнных перамен ва ўрбананімным ландшафце Мінска. Больш дакладна вызначана колькасць вуліц і прадмесцяў Мінска і яе змяненні ў даследуемы перыяд. Складзены табліцы масавых перайменаванняў, прасочаны змены назваў найважнейшых гарадскіх вуліц ад 1793 да 1991 г., адзначаны суадносіны паміж патранімічнымі і непатранімічнымі назвамі вуліц і вызначана іх структура. Выяўлены асноўныя прынцыпы фарміравання ўрбанонімаў у 1793–1991 гг. Пры гэтым адноўлены і лакалізаваны дзясяткі страчанных у апошнія дзесяцігоддзі найменняў. Створана аснова для адраджэння забытых назваў (у выглядзе корпуса назваў вуліц, плошчаў, мікрараёнаў, паркаў, станцый метро) на сучасным этапе развіцця горада. Зазначым, што гэта першае ў айчыннай гісторыяграфіі спецыяльнае комплекснае даследванне унутрыгарадскіх назваў Мінска канца XVIII– XX ст.

**Абаснаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, якія сфармуляраваны ў дысертацыі**. Метадалагічную базу дысертацыі склалі прынцыпы аб'ектыўнасці, гістарызму і прынцып каштоўнасці ў гісторыі. Для дасягнення пастаўленых задач і мэты даследавання былі выкарыстаны агульнанавуковыя (абагульненне, аналіз, аналогія, сінтэз, параўнанне) і спецыяльныя гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны).

Аб'ектыўнасць вынікаў навуковага даследавання была дасягнута праз шматбаковы аналіз разнастайных крыніц, вывучэнне і выяўленне сутнасці прадмета даследавання, яго сувязяў з іншымі аб'ектамі гістарычнага працэсу адпаведнага храналагічнага перыяду. Пры рабоце над крыніцамі, ацэнцы іх гістарычнай значнасці, дакладнасці прыведзенай у іх інфармацыі выкарыстоўвалася знешняя (вызначэнне сапраўднасці, аўтарства і мэты, месца і часу стварэння) і ўнутраная (параўнанне варыянтаў, вызначэнне паўнаты і

значнасці інфармацыі) крытыка крыніц. Гэта дазволіла выявіць крыніцы, якія найбольш поўна адлюстроўваюць урбананімны ландшафт Мінска. Ступень дакладнасці інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў іх, даволі высокая, паколькі яны з'яўляюцца крыніцамі афіцыйнага паходжання і ствараліся ў даследуемы перыяд.

У першай главе "Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання" аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі сведчыць, што ўмовы і заканамернасці фарміравання ўрбананімнага ландшафту Мінска ў 1793–1991 гг. не з'яўляліся асобным прадметам даследавання. Пры гэтым, сукупнасць крыніц па ўнутрыгарадскіх назвах Мінска з'яўляецца разнастайнай і рэпрэзентатыўнай, што па сваёй сутнасці спрыяе паспяховаму даследаванню. У поле зроку практычна ўсе публікацыі не толькі айчынных, але і шэрагу замежных аўтараў, што дазваляе вызначыць этапы і іх асобныя храналагічныя рысы, уласцівыя ім асаблівасці, фарміраванне гарадазнаўства з апісальнай метадалогіяй. Заўважана, што другі этап гістарыяграфіі паглыбляўся на аснове нацыяльна-дзяржаўнага будаўніцтва, актывізацыі краязнаўчага руху, каардынацыі дзейнасці з боку навучальных устаноў БДУ і Інбелкульта. Але ж адсутнасць прац па тапаграфіі і тапаніміі ў 1930–1940-я гады – адмоўная навуковая характарыстыка часу. Заўважана, што з прыцягненнем ўвагі спецыялістаў у галіне археалогіі з 1950-х пачаты этап структурнай архітэктуры гарадоў Беларусі, у тым ліку Мінска, на аснове пашырэння гарадскога ладшафта, папулярызацыі тапанімікі, як навукі пра паходжанне геаграфічных назваў. Вянцом дадзенага перыяду стала першае даследаваннне ўрбанонімаў горада-героя Мінска, выдадзенае асобнай кніжкай (1979), пашырэнне цікавасці да гісторыі і культуры горада з нагоды яго 900-годдзя (1967).

Чацвёрты этап на думку аўтара вызначаны павышэннем ролі акадэмічнай навукі, у тым ліку за кошт супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. У пераліку такія асобы як З.Ф. Краўчанка, Г.В. Штыхаў, З.В. Шыбека, С.В. Шыбека, Л.М. Лыч, В.Ф. Голубеў. На заключным этапе з 1990-х без увагі не засталася вучоныя-мовазнаўцы, архівісты, а таксама доктарская манаграфія «Мінскі фенамен» – нямецкага даследчыка, прафесара Томаса Бона. Радуе, што аўтар прадстаўленнага даследавання таксама адзначаны ў самым насычаным гістарычнымі адкрыццямі часе, якія ў розных фарматах закраналі урбананімныя праблемы і, што значна, спрыялі новым тэматыкам, накірункам, параўнальнасці і факталогіі ўдакладнення. Тым не менш, у гэты час цэльнага і

сістэмнага ўяўлення пра структуру і змены ва ўрбананімным ландшафце горада Мінска – не з'явілася.

Пры ўсім, хацелася б звярнуць увагу аўтара на магчымасць уключення ў гістарыяграфічны зварот працы вядомых замежных спецыялістаў па гістарычнай памяці з поглядамі на праблемы горада, яго міжнароднай нарматыўна-прававой асновы, захаване гісторыка-культурнай спадчыны, калектыўнай ідэнтычнасці (гл.: Морыс Хальбвакс, Ларына Рэпіна, Ян і Алэйда Асман, Юры Лотман, Патрык Хатон, П’ер Нора, Поль Рыкёр, Освальд Шпэнглер, Ханс-Георг Гадамер). Да навуковага аналізу патрэбна далучыць манаграфічную працу беларускай даследчыцы О.М. Сакаловай (гл.: Соколова, О. М. Минский текст: проблематика культурной памяти столичного города в условиях цивилизационного пограничья / О. М. Соколова ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2017. – 417 с.).

Крыніцазнаўчы агляд шырока дэманструе інфармацыяныя рэсурсы архіўных установ Беларусі, спробу прадстаўлення разнастайных комплексаў крыніц, асаблівасцей афармлення матэрыялаў справаводства ў розныя часы. Значнае пашырае гарызонт даследавання ўключэнне статыстычна-даведачных выданняў, картаграфічнага матэрыялу, перыядычных выданняў, дакументаў асабістага паходжання, якія ў сваёй савакупнасці з’яўляюцца колькаснымі, разнастайнымі і рэпрэзентыўнымі. Але ж і тут ёсць магчымасць далучэння да сістэмнага аналізу папулярных у грамадскім асяроддзі Інтэрнэт-рэсурсаў («Урбанистический Минск», Интернет-проект «Улицы города Минска, названные именами учёных», База данных «Их именами названы улицы Минска», «Заброшенные места Минска», «Загадки минской топонимики: самые странные улицы города», Публичная кадастровая карта).

У другой главе “Стан унутрыгарадскіх назваў у 1793–1916 гг.” дэманструецца пашырэнне урбананімнага ландшафта Мінска на аснове павелічэння колькасць назваў вуліц і плошчаў ад 37 да 284, ці ў 7,5 разоў. У першай пал. XIX ст. назвы вуліц і плошчаў Мінска яшчэ захоўвалі традыцыі папярэдняй эпохі Рэчы Паспалітай. Пры гэтым, у залежнасці ад спосабу іх фарміравання і дзяржаўнай палітыкі аўтар выяўляе межы 2 этапаў. Першы (1793–1865) абазначаны існаваннем аўтаномнага спосабу фарміравання ўрбананіміі. На другім – фарміраванне і разгортванне інстытуцыянальнага спосаба ўнутрыгарадскіх найменняў (1866–1916). Падкрэслім, што аўтарскі падыход па вызначэнню фактарнасці ў назвах вуліц і плошчаў пры ўжыванні

вялікай колькасці факталагічнага матэрыялу – сістэматазываны і верыфікаваны архіўнымі, картаграфічнымі і арыгінальнымі люстрацыямі. У такой вялікай колькасці факталогіі прывабна глядзяцца дадзеныя аб першым дакументальна зафіксаванным у Мінску перайменаваннем унутранных гарадскіх аб'ектаў (1866 г.), з'яўленне шыльдаў з назвамі ў 1880 г.

Пры высновах, дзе маючая большасць матэрыялаў пры фарміраванні ўрбананіміі Мінска дэманструе дзяржаўныя улады як асноўны узгоджаны рэгулятар не толькі дзяржаўнай, але і прыватнай сферы – вынікае супярэчанне і сумніў аб іх адсутнасці. Далейшы час толькі пацверджае такую думку, калі пасля небяспечных палітычных выступаў польскай накіраваннасці 1863–1864 гг. сімвалічныя адзнакі мінулага з пазіцыі Мінскага губернатара – страчваюць за польскім часам змест і сэнс, яны нягродныя і чужыя русскай адміністрацыі (С. 36).

Важная характарыстыка стану 1914–1915 гг. падаецца даследчыкам праз павялічэнне колькасці безыменных вуліц і завулкаў, падвойных назваў. Безумоўна, што гэта вызывала незадаволеннасць не толькі гарадскіх службаў, але і гараджан. Тут факталагічны матэрыял толькі падцвярджае высновы. Пры гэтым, можна было б аўтару ўзгадаць, што менавіта такія значныя ўплывы звязаны з падзеямі Першай сусветнай вайны – эвакуацыяй насельніцтва, перамяшчэннем вялікай колькасці вайсковых часцей і падраздзяленяў, павелічэннем для патрэб арміі гаспадарчых і інтэнданцскіх складоў, а таксама атрыманнем Мінскам прыфрантавого статуса. Гэта прывяло да павялічэння амаль у два разы колькасці насельніцтва за кошт мабілізаванных салдат, обслугоўваючага персанала, эвакуіраванных. Таму набліжэнне лініі фронта, падпарадкаванне цывільных органаў вайсковым, а потым і акупацыя Мінска падштурхнула да перамен у адносінах да нямецкай супольнасці горада, у тым ліку да нямецкіх назваў вуліц і завулкаў (С. 41–42).

Глава трэцяя "Фіксацыя рэвалюцыйных і ваенных падзей, вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва ва ўнутрыгарадскіх назвах Мінска ў 1917–1944 гг." складае асноўную і дынамічную частку даследавання як трэці этап развзіцця урбананіміі Мінска. У зменлівым палітычным часе пры найменаванні ўнутрыгарадскіх аб'ектаў савецкія ўлады актыўна выкарыстоўвалі патранімічны прынцып у гонар дзеячаў Камуністычнай партыі, савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага руху, герояў Грамадзянскай вайны, пісьменнікаў, вучоных, лётчыкаў СССР. У гэты час папулярным стаў новы сімвалічны прынцып, паводле якога найменні

прапагандавалі савецкія святы, арганізацыі і стваралі вобраз сацыялістычнага горада. Разам з гэтым шырока прымяняліся тапаграфічны, геаграфічны, геданімічны прынцыпы. А вось этна-рэлігійны, амаль не выкарыстоўваўся, а адпаведныя назвы вуліц увогуле зніклі з карты Мінска ў 1930-я гг. Савецкія назвы сталі часткай жыцця гараджан. Урбананімія Мінска змянілася ў гэты час кардынальна.

Пры гэтым, звернем увагу, што пры наяўнасці невялікага польскага перыяду для Мінска, прысутнасць германскай улады ў Мінску з лютага – снежня 1918 г., калі плошчы і вуліцы сталі для іх месцамі ганаровай публічнай прысутнасці ў якасці парадаў, урачыстасцей, спатканняў, пэўнай гаспадарчай актывізацыі, не заўважана. Таксама як і караткачасовасць Літоўска-беларускай дзяржаўнасці (люты–ліпень 1919), дзе Мінск выступаў у ролі сталіцы. У падсумаваннях – мінская урбананімія паўтарала палітычныя метамарфозы ў рэчышчы савецкага грамадскага ладу краіны з прыданнем партрэтнасці дзеячоў і большай вайсковасці ў назвах (С. 69).

Пры гэтым, час германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.) праз ідэалагічныя змены дасканала прадстаўлены аўтарам. Зафіксаваныя загады ваеннага боку, дзе толькі 4 лістпада 1941 г. загадам палявой камендатурай у Мінску было заменена 126 назваў з «бальшавіцкім зместам» (70). Дакументальна зафіксавана загадамі ад ліпеня, 1 кастрычніка, 4 лістапада 1941 г., 22 кастрычніка 1941 г. 22 сакавіка 1944 г. (71, 73). Тут і пэўна не адзінкавыя кур'ёзы прыкладаў, калі ў 1943 г. адрас "Беларускай газэты" пазначаўся па-нямецку Kirchenstrasse (Царкоўная), а па-беларуску – вул. Рагнеды (С. 71). Вуліцу "Луцкевича" канспіратыўна маглі адносіць "Луцевича" (Янкі Купалы) і далей, сумніў аўтара, гэта «можна пераблытаць нават беларусу, што ж казаць пра рускамоўных партыйных начальнікаў» (С. 71). Прыцягванне ўвагі, што беларускія калабаранты былі незадаволены афіцыйным перайменаваннем вуліц і плошчаў горада, што праявілася ў альтэрнатыўным перайменаванні вуліц Мінска, патрабуе аўтарскга доказу (С. 74). Не зусім можна пагадзіцца пра вызначенні 16 вуліц ваеннага Мінска (12 %) сімвалічнымі. Нават кароткі іх пералік падказвае не сімвалічны, а вайсковы характар: Вартаўнічая, Пехацінская, Артылерыйская, Радыстаў, Камендатурная, Пераможцаў, зав. Штурмавы і Грэнадзёрскі (С. 72).

Пры гэтым патрабуецца дадатковая інфармацыя пра урбананімію асобнага жыллёвага кварталу Мінска – гета, які з ліпеня 1941 да кастрычніка 1943 г. існаваў для прымусовага ўтрымання, потым знішчэня каля 80 тыс. не

толькі яўрэяў Мінска і ваколіц, але і дэпартаваных з Германіі, Аўстрыі і Чэхіі. Гэта тычыцца каля 40 вуліц і завулкаў, якія замест існуючых савецкіх назваў атрымалі новую – лічбавую нумарацыю.

Для разумення працэсу ўрбананіміі Мінска правільным было засведчыць інфармацыйна пра больш чым 800 тыс. забітых і памерлых у горадзе і наваколлі, а ў Беларусі – кожнага трэцяга загінуўшага і кожнага чацвёртага барацьбіта супраць нацызму ў складзе Чырвонай арміі, партызанскім і падпольным руху Вялікай Айчыннай вайны. У такім разе з'яўленне першых мемарыяльных дошак ў гонар герояў, гістарычных падзей ў назвах вуліц горада было б карысным аўтару выявіць і засведчыць.

Глава чацвертая «Унутрыгарадскія назвы Мінска ў 1945–1991 гг.» ахоплівае ўнікальную з'яву урбанізацыі ад разбураннага вайной горада з 50 тысячным насельніцтвам да імклівага росту (1,6 млн) разам з прамысловымі зонамі, далучанай тэрытарыяльнасці вёсак і пасёлкаў, фарміраваннем складанай гарадской інфрастуктуры мікраараёнаў. У гэтым працэссе аўтарам вызначаецца паслядоўная дзяржаўная палітыка на аснове савецкіх традыцый. У прыярытэтах, на падставе атрыманных дадзеных, найбольшай патранімічнай часткі найменняў вуліц, больш за ўсё было ўшанавана дзеячаў расійскай гісторыі і культуры. Шмат вуліц было названа ў гонар салдат і афіцэраў Савецкай арміі – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Затым ідзе група ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага рухаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Тут бачыцца сістэма вызначанных прыярытэтаў пры разных падыходах, калі адна группа на аснове аб'яднання блізкіх катэгорый, то другая – салдаты, партызаны і падпольшчыкі, таксама маючая глыбокую ўзаемасувязь, раздзелена і абасоблена (С.108). Пры гэтым, заўважана ўшанаванне ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, кіраўнікоў Камуністычнай партыі, дзеячоў беларускай гісторыі і культуры. Заставаўся папулярным пры найменаванні новых вуліц геаграфічны, менш тапаграфічны і сімвалічны прынцыпы. Адзінкавыя найменні былі створаны па геданімічным і прафесійным прынцыпах. Значны перагляд такіх падыходаў зафіксаваны ўжо пад час перабудовы – ўпершыню створаннай камісіяй па найменаванні гарадскіх вуліц. Гэтаму спрыяла пры значным росце ўрбананіміі наяўнасць каля 40 % паўторных найменняў. Сацыяльна-эканамічны харарктар набыў у урбананіміі значны характар. Вёскі і пасёлкі, трапляючы ў межы Мінска, у большасці гублялі сваю ідэнтычнасць. Тут большая ўвага да сацыяльнай і нацыяльнай стратыфікацыі урбанізаванага насельніцтва Мінска

дазволіла бы больш глыбока вызначыць узроўні ўрбананіміі дзяржаўнай палітыкі.

Пры гэтым, звернем увагу на тлумачальнасць тэрмінаў: «ідэалагічныя», «неідэлагічныя» перайменаванні; сімвалічныя прынцыпы і назвы (С. 10, 58, 64, 77, 89, 90, 93, 95, 112); асабістыя выразы «магчыма», «хутчэй за ўсё» (С. 30, 50, 54, 57, 59, 61, 63, 65, 72, 97, 100, 102, 105), правапіс : завулак Татарскі За Мячэццю, Высокі Рынак, Ніжні Рынак (С. 28, 31, 33, 34, 36, 38, 46, 54); скарачэнне «ВАВ» (С. 85); малаінфармацыйнасць персаналій у выглядзе пераліку прозвішчаў; захапленне тапаністычнай эўрыстыкай У дадатках малюнкі без удакладнення крыніц В 4, В 5 (С. 149, 150, 152, 153); Е 1 (С. 160, 161); акты ўкаранення (С. 168–172).

Прадстаўленнае даследаванне падрыхтавана на шырокай гісторыяграфічнай аснове. Бібліяграфічны спіс дысертацыйнага даследавання ўтрымлівае 450 пазіцый, з якіх 44 – публікацыі аўтара (разам 27 старонак).

**Научная, практическая, экономическая и социальная значимость результатов диссертации с указанием рекомендаций по их использованию**

Палажэнні і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні прац па гісторыі Беларусі канца XVIII – XX ст., распрацоўцы гісторыі Мінска, гісторыі адукацыі; а таксама як матэрыял для турыстычных выданняў, гарадской інфраструктуры, музейных экспазіцый. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі неаднаразова выкарыстаны ў сферы гарадской гаспадаркі пры рабоце Камісіі па найменаванні і перайменаванні вуліц і іншых састаўных частак г. Мінска.

**Публікацыйнасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены ў 44 публікацыях, сярод якіх 8 артыкулаў у навуковых часопісах і зборніках, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь, 36 – у іншых навуковых зборніках і матэрыялах канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных прац складае 16 друкаваных аркушаў.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Мэта і задачы дысертацыі вызначылі яе ўнутраную структуру. Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў: Дысертацыйнае даследаванне з’яўляецца вынікам самастойнай працы аўтара. Пры падрыхтоўцы дысертацыі быў выяўлены, апрацаваны і прааналізаваны вялікі масіў архіўных крыніц, большая частка з якіх упершыню ўведзена ў навуковы абарот. Усе навуковыя публікацыі

падрыхтаваны саіскальнікам асабіста. Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі распрацаваны аўтарам самастойна і прайшлі апрабацыю на 18 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях. З 2003 да 2023 г. аўтар з'яўляўся членам Камісіі па найменаванні і перайменаванні вуліц і іншых састаўных частак горада пры Мінгарвыканкаме, на пасяджэннях якой неаднаразова прымаліся рашэнні па адраджэнні забытых гарадскіх найменняў, зафіксаваных у даследаванні.

Змест і афармленне дысертацыі І.І. Сацукевіча адпавядаюць патрабаванням, якія прад'яўляюцца да навуковых дысертацый. Аўтарэферат дысертацыі дастаткова поўна раскрывае змест самой дысертацыйнай працы іне утрымлівае інфармацыі, па-за межамі яе тэматыкі.

**Соответствие (несоответствие) научной квалификации соискателя ученой степени, на которую он претендует.**

Такім чынам прадстаўдзенннае дысертацыйнае даследаванне адказвае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь (пп. 19-26 «Положения о присуждении ученых степеней и присвоении ученых званий в Республике Беларусь», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь 17.11.2004 No 560 (в редакции Указа Президента Республики Беларусь 02.06.2022 No 190)), а яго аўтар – Сацукнвіч Іван Іванаіч заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

– структурную распрацоўку спосабаў урбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг.;

– вызначэнне ролі дзяржаўнай палітыкі, дзяржаўных органаў Расійскай імперыі, БССР фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг.;

– характарыстыку карэннай трансфармацыі ўрбананімнай сістэмы Мінска (1917–1922 гг.) савецкай улады ў рэчышчы асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця БССР;

– вызначаэнне этапаў урбананіміі Мінска і іх характарыстык фарміравання спосабаў замацавання найменняў.

Афіцыйны апанент
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага універсітэта К.І. Козак

БГУ
Исторический факультет
ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ: